Газэта рабоча-сялянскай моладзі Беларусі

Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Чырвоная Зьмена

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Ленінскага Камуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

№ 14 (396) Серада, 2 лютага 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню: у сераду, пятніцу і нядзелю. | Год выд. VI. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. дню. Тэл. № 903 | Адрас Выдавецтва ЦК ЛКСМБ, Чырвоная Зьмена» Менск, Камсам. 25

Да 3-й Менскай Акруговай Конфэрэнцыі ЛКСМБ

5 га лютага пачыняе сваю работу наша акрконфэрэнцыя. За апошні год Менская організацыя ЛКСМБ значна ўзрасла. Узрасла яна колькасна (на 37,6 проц., у сучасны момант налічвае 9.243 сяброў і кандыдатаў ЛКСМБ), ўзрасла і ідэйна. Узвысіўся ідэйны ўзровень організацыі, узмацнілася Ленінскае адзінства яе шэрагаў.

Яскравым паказацелем памянёнага зьяўляецца раней за ўсе той адзінадушны і той дружны адпор, які давала Менская організацыя многакратным фракцыйным выступленьням опозыцыйнага блёку.

Менская організацыя паказала сябе сапраўднай Ленінскай організацыяй, якая ідзе пад кіраўніцтвам нашай слаўнай бальшавіцкай компартыі, гатовай ва ўсякі час даць рашучы адпор кожнаму, хто адважваецца замахнуцца на цьвярдыні ленінізму. кожнаму хто спытаецца падарваць жалезную дысцыпліну і адзінства ў партыйных і комсамольскіх шэрагах.

Як-раз пагэтаму' як раз дзеля таго, што наша організацыя зьяўляецца сапраўднай Ленінскай організацыяй, яна і ў практычнай працы па соцыялістычнаму будаўніцтву мае за мінулы год шэраг сурёзных дасягненьняў.

Дапамога партыі ў ажыцьцяўленьні практычных пытаньняў будаўніцтва соцыялізму, стаялі і будуць стаяць у цэнтры ўвагі адчыняючайся 3-й акруговай конфэрэнцыі.

Конфэрэнцыя, бязумоўна, будзе праходзіць пад знакам дзелавой работы.

Дзелавыя практычныя пытаньні будуць вырашацца пад вуглом старэннай праверкі выконваньня дырэктыў 14-га зьезду партыі, 7 га зьезду УсеЛКСМ і 8-га зьезду ЛКСМБ, у конкрэтных умовах акругі.

Конфэрэнцыя падвядзе вынікі нашай гадовай работы, падагуліць дасягненьні, па Ленінску ўскрые недахопы (якіх, зразумеля, маецца нямала) і на грунце ўсяго гэтага вызначыць далейшыя задачы нашай практычнай работы.

Пытаньні гаспадарчага будаўніцтва (стрыжань работы КПБ), удзел комсамолу ў ім (як стрыжневая задача КСМ) у першую чаргу павінны зьвярнуць на сябе ўвагу конфэрэнцыі.

Як і чым дапамагчы партыі, каб забясьпечыць найбольш хуткі узрост соцыялістычных элементаў гаспадаркі каб як магчыма лепей экономічна біць нашага працўніка—часьніка каб палепшыць працу па правядзеньню рэжыму экономіі, па зьніжэньню розьнічных цэн, па коопэрыраваньню сялянства, як праводзіць у жыцьце ў конкрэтных умовах акругі лёзунг партыі аб індустрыялізацыі, -- вось прыкладна кола пытаньняў, па гаспадарчай лініі, на якія конфэрэнцыя павінна даць адказы.

Далей пытаньні культурна-масавай работы павінны падлегчы старэннаму абгаварэньню на конфэрэнцыі, пад вуглом погляду паляпшэньня яе.

Організацыя мас навакол практычнай работы па соцыялістычнаму будаўніцтву, увязка культурна-масавай работы з політычным жыцьцём, паглыбленьне выхаваўчай работы (работа гурткоў, політшкол, клюбаў, юнсэкцый і г д.), палепшаньне ўдзелу ў працы профсаюзаў, Гарсавету і г. д —весь кола пытаньняў другой групы.

Урэшце, пытаньні комсамольскага будаўніцтва—„крызіс росту“ ў КСМ, з якога організацыя яшчэ ня вышла. Паглыбленьне Ленінскага выхаваньня комсамольскіх шэрагаў, узмацненьне ўвагі організацыі да работы піонэр. організацыі, увагі па комуністычнаму выхаваньню трэцьцяга пакаленьня, далейшае ўзмацненьне Менскай організацыі, як Ленінскай. Выхаваньне кіруючых кадраў комсамольскага актыву з лепшых партыйцаў — комсамольцаў, рабочых, ведаючых задачы клясавай барацьбы ў умовах барацьбы соцыялістычных элемэнтаў з элемэнтамі капіталістычнымі, ведаючых мясцовыя ўмовы, быт, мову. Палепшаньне якасьці працы організацыі, асабліва ячэяк.

Конфэрэнцыя павінна сур'ёзна абгаварыць усе пытаньні, зьвязаныя з хутчэйшым выхадам організацыі з „з крызысу росту“, гэта значыцца—абгаварыць пытаньні аб ажыўленьні нашай працы, павышэньне якасьці працы,—гэта трэцяя група пытаньняў, якім конфэрэнцыі прыдзецца ўдзеліць сур'езную ўвагу.

Бязумоўна, што пры вырашэньні усіх гэтых пытаньняў, конфэрэнцыя будзе выходзіць з вучоту конкрэтных абставін акругі.

Умовы працы Беларускай комсамольскай організацыі патрабуюць сур'ёзнай увагі да правядзеньня нацыянальнай політыкі, асабліва ў частцы беларусізацыі організацыі. Гэта пытаньне павінна будзе заняць значнае месца ў рабоце конфэрэнцыі. Таксама конфэрэнцыя павінна зьвярнуць увагу на пытаньне абароны краіны, пытаньні боездольнасьці нашае організацыі.

Прашоўшыя раённыя конфэрэнцыі паказалі вельмі значны ўзрост грамадзка-політычнай актыўнасьці нашай Менскай організацыі і рабоча-сялянскай моладзі, і паказалі імкненьне ўсіх комсамольцаў займацца сапраўднай дзелавой практычнай работай, а не балталёгіей.

Як раз гэта зьяўляецца посьпехам таго, што акруговая конферэнцыя актыўна і дзэлавіта, па Ленінску абгаворыць і вырашыць стаячыя пытаньні; вырашыць іх у прызнаньні цяжкасьцяй работы, але і ў прызнаньні таго, што трэба гэтыя цяжкасьці ўпарта, крок за крокам, перамагаць, а не падаць перад імі на калены.

П. ШАЛІМА.

Перавыбары разгортваюцца

Весткі з Віцебскай акругі

Ліст ЦК ЛКСМБ аб удзеле ячэек у перавыбарнай кампаніі і быў амаль што усімі вясковымі ячэйкамі распрацован на сваіх сходах і па ім намечаны больш менш практычныя прапановы.

Падрыхтоўчая работа да перавыбароў прыцягнула значную ўвагу нашых вясковых актывістаў. Некаторыя Райкомы пытаньне праработалі на пашыраных пленумах, скарыстоўваючы для намячэньня практычных прапаноў працаўнікоў Райвыканкомаў.

З Ліозьнянскага раёну паведамляюць аб тым, што інструкцыя прапрацоўвалася ўсімі ячэйкамі КСМ. У многіх раёнах пытаньне аб перавыбарах ставілася на культднях моладзі, а ў Лозьнянскім раёне нават былі скліканы 2 сходы дзяўчат.

Ёсь шэраг фактаў калі пры абгаварэньні на сходах беднаты кандыдатур у сельсавет комсамольцам атвоў не давалі і нават комсамольскія кандыдатуры карысталіся падтрымкай. У Быльнінскім сельсавеце, Езярышчанскага раёну абраны ў сельсавет 2 комсамольцы, пры чым выбары праходзілі без атводаў, і акрамя таго сяляне высунулі ў рэвізыйную камісію аднаго комсамольца.

У адным сельсавете памылкова быў высунут выключаны комсамолец і сяляне далі яму атвод, замест яго выбраўшы другога комсамольца. У Любашкоўскай ячэйцы Высачанскага раёну на справаздачны сход зьявіліся цалком усе комсамольцы і прыцягнулі шмат моладзі.

Такім чынам па вышэйпрыведзеным фактам відаць што ёсьць дасягненьні, але маюцца і недахвоты. Так напрыклад у Высачанскай ячэйкі комсамольцы добра апавясьцілі аб сходзе а самі на сход не зьявіліся.

У Шумілінскай ячэйцы Сіроцінскага раёну на справаздачны сход усе комсамольцы не зьявіліся.

Яшчэ ня досыць добра абстаіць справа з уцягненьнем у перавыбарную кампанію дзяўчат і батракоў, ня кожная комсамольская ячэйка дабілася найбольшага ўцягненьня ў перавыбарную кампанію моладзі, ня кожная ячэйка дастаткова організавала належным чынам моладзь.

Вывады нашага ўдзелу у перавыбарнай кампаніі рабіць яшчэ рана, гэта пакажа будучыня.

Міхась Лабадаеў.

Пілсудчына хоча затапіць у крыві беларускі рух

Кіраўнікі правых партыяў націскаюць на Пілсудзкага, каб дамагчыся ад яго згоды на самыя суровыя меры расправы з арыштаванымі, на арышты сярод украінцаў

У ўрадавых колах абгаварваецца прапанова перадаць военна-палявому суду некалькіх арыштаваных

Фабрыка сьмерці

Андрэй Александровіч

Сучасны лад у Польшчы зьдзекамі і катаваньнем працоўных Заходняй Беларусі перасягнуў былую царскую Расію.
(З газэт).

Кра'на родная!.. Дарогі крыжавыя,
Скажыце гоманам нахмураных
прысад:
— Глумілі нас фэльдфэбелі Расіі
Як быццам поле ў буру буйны град.
Дарыла торбы нам, жабрачыя
дарыла,
„Культура“ чорная разьюшаных
баяр.
На струны з нас зьдзіралі нашы жылы
Смакталі кроў: памешчык і жандар.
Сьвету яснага ня бачыў край вякамі,
Грудзі кволыя сьціскаў халодны мур.
Слова роднае закоўвалася ў камень;
Народ наш знаў: турму і сьмертны
шнур.
Прашлі гады... народ з няволі вышаў.
Жыцьцё інакшае снаткала Беларусь.
Але мы помнім, помнім на Лукішках
Быў павешаны адважны наш
Кастусь.
І сёньня... там... у загранічных ботах
Жандары—найміты крываваю разьнёй
Нашых змучаных братоў за польскі
„злоты“
Зьвярына катуюць накінуўшысь
грунём.
Зарасьлі былі сьляды баяр
праклятых,
Загінуў бляськ фэльдфэбельскіх
пагон.
А сёньня... там .. будуюць казематы!
А сёньня . там... нявед мы
прыгон.
Па сьпінах мужыкоў ангельскі сьвішча шомпал,—
Гуляе паншчына—пракляты чорнацьвет.
Чаго ж маўчыць культурная Эўропа?
Крык зьняволеных даносіцца ў сусьвет!
Зноў Лукіскіх камер нехапае,
Зноў шляхі афарбавала кроў...
Што-ж паноў разьюшаных стрымае?

Правіць турмамі Пілсудзкі—
Мараўёў.
Але шляхі ня змыць ім і крывёю;
Народзіць воля новы сьветлы дзень
І радасьць сьветлую, новы дзень з
сабою—
Братом прыгнечаным адважна прывядзе.
... Краіна родная. Дарогі крыжавыя,
Гудзіце гоманам нахмураных
прысад;
Польшча сёньня,—як царская
Расія,
Краіна сьмерці! Краіна цёмных
крат.

Новая галадоўка арыштаваных.

Політычныя арыштаваныя віленскай турмы „Лукішкі“, якія нядаўна спынілі надта доўгую і цяжкую галадоўку, 21 студзеня ізноў абвясьцілі галадоўку.

Апошняя абвешчана ў знак салідарнасьці з арыштаванымі дэпутатамі Беларускае Сялянска-Рабочае Грамады,

Поліцэйскі кантроль над сакратарыятам Грамады

Далейшы разгром беларускіх організацый

Згодна паведамленьняў віленскіх газэт, цэнтральны сакратарыят Беларускай Грамады заняты поліцыяй. Уся надыходзячая на адрас сакратарыяту корэспондэнцыя перадаецца прокуратуры. Зачынены беларускі коопэрацыйны банк, коопэрацыйнае таварыства, школы і гімназіі. Апошнія нумары беларускіх газэт «Народная Справа» і „Сялянская Ніва“ конфіскованы.

Да моманту разгрому Беларуская Грамада налічвала звыш 1.200 гурткоў (ячэек), у якіх было згуртавана звыш 100.000 чалавек.

Усе аддзяленьні беларускага коопэрацыйнага банку, а таксама беларускія культурна-асьветныя організацыі ў провінцыі, спынілі сваю дзейнасьць.

„Дом селяніна“

«Заходняя Беларусь»—адна вялікая турма
(з прамовы беларускага дэпутата ў польскім сойме)

На пэршым пляне—кіраўнік домам—Пан Піл—уцкі

Што вырашыла 4 сэсія ЦВК БССР.

Артыкул усебеларускага старасты тав. Чарвякова

4 сэсія аформіла пастановы ўрадаў БССР і РСФСР у галіне далучэньня да складу Беларусі ўсіх прылежных тэрыторый з большасьцю беларускага жыхарства.

Праца 4 сэсіі супала з масавымі арыштамі ў Польшчы беларускіх дзеячоў

Гэта мімаволі накіравала ўвагу сяброў ЦВК Беларусі ў бок параўнаньня становішча рабочых і сялян Савецкай Беларусі і Заходняй Беларусі

У той час, калі Савецкая Беларусь, якая ўваходзіць у склад Саюзу ССР, мае ўсе магчымасьці для свайго экономічнага і культурнага разьвіцьця, калі нацыянальнае пытаньне ў Саюзе ССР вырашаецца такім парадкам, каб зьнішчыць усе абмежаваньні, рознае прыгнечаньне і г. д.,—за рубяжамі Савецкага Саюзу ня спыняе панаваць уціск, прасьледаваньні, арышты і інш.

Значыць, першае значэньне 4 сэсіі заключаецца ў тым, што яна яшчэ раз даводзіць, што толькі саветы забясьпечваюць усім прыгнечаным народам фактычнае права на вольнае разьвіцьцё. Разам з гэтым 4 сэсія можа служыць прыкладам таго, як правільна ленінскае вырашэньне пытаньняў пролетарскай і нацыянальнай барацьбы аб'яднае і згуртоўвае навакол саветаў рабочых, сялян і ўсіх працоўных.

Вялічэзную ўвагу сэсіі выклікае абмеркаваньне кодэксаў аб шлюбе, сям'і і апецы і водна-мэліорацыйнага

На абмеркаваньне кодэксу аб шлюбе, сям'і і апецы асаблівы інтарэс і асаблівую ўважлівасьць зьвярнулі сябры ЦВК—жанчыны і сяляне. Гэта сьведчыць аб значэньні кодэксу.

Жанчына шукае ў кодэксе замацаваньня правоў, якія дадзены ёй рэволюцыяй. і абароны ад таго зьневажальнага становішча, у якім яна знаходзілася да рэволюцыі.

Селянін імкнецца праз гэты кодэкс надаць выразнасьць у маемасныя адносіны, бо шлюб выклікае шмат матэр'яльных абавязацельстваў між уступаючымі ў шлюб.

Мэліорацыйны кодэкс прадстаўляе сабой першую ў СССР спробу сыстэматызаваць наша законадаўства ў галіне водзяной гаспадаркі і мэліорацыі

Да гэтага пытаньня ЦВК падышоў з асаблівай асьцярожнасьцю па наступных прычынах:

Папершае, гэты закон мае вялічэзнае значэньне для Савецкае Беларусі, бо павіненператварыць 20 процантаў зямельнай плошчы з балот ва ўдобіцу.

Узяўшы гэты закон у аснову, сэсія даручыла прэзыдыуму канчаткова зрэдагаваць яго,

Пры разглядзе пытаньня аб прамысловасьці сэсія адзначыла малы тэмп яе разьвіцьця

і, грунтуючыся на патрэбах гораду і вёскі, ухваліла аддаваць гэтаму пытаньню яшчэ больш увагі.

З вялікай уважлівасьцю 4-ая сэсія абмяркоўвала пытаньне наконт гандлю. Галоўнае значэньне гэтага пытаньня ў павялічэньні барацьбы за зьніжэньне цэн, за палепшаньне нашага гандлёвага апарату, за заваёву рынку.

Гандаль павінен спрыяць зьбліжэньню гораду і вёскі

павінен сваё галоўнае значэньне бачыць у неабходнасьці магчыма лепш абслугоўваць патрэбы рабочых і сялян, спрыяючы гэтым палепшаньню іх матэр'яльнага становішча.

Такім парадкам, агульнае значэньне 4-й сэсіі заключаецца ў тым, што яна можа служыць прыкладам, як на агульным фоне прыгнечаньня працоўных мас буржуазіяй у капіталістычным сьвеце, узаемнай конкурэнцыі буржуазных дзяржаў, іх барацьбы за першынство, іх імкненьне да нападу на СССР—Саюз ССР і яго часткі ажыцьцяўляюць задачы мірнага соцыялістычнага будаўніцтва на основе ўдзелу ў кіраваньні дзяржаваю самых працоўных і забясьпячэньня кожнай групе працоўных, незалежна ад нацыянальнай і іншай розьніцы, фактычнай магчымасьці для экономічнага і культурнага разьвіцьця.

Дзяўчына--наш раўнапраўны таварыш!

У газэце ЦК УсеЛКСМ „Комсамольская Праўда“ быў зьмешчаны ліст Маскоўскіх комсамолак—працаўніц, у якім яны паказалі на шэраг ненармальнасьцяў ва ўзаемаадносінах хлапцоў і дзяўчат.

Мы зьмяшчаем голас Ляхаўскіх комсамолак. Неабходна ўсім ячэйкам абсудзіць і перапрацаваць гэты ліст Маскоўскіх комсамолак і намеціць шэраг практычных мерапрыемств у працы свае ячэйкі, для зьнішчэньня ненормальнасьцяй. Чакаем ад чытачоў водгукаў.

Лісты маскоўскіх і Іванава-Вазьнясенскіх дзяўчат правільны

так сказалі дзяўчаты-комсамолкі заводаў Ляхаўскага раёну гор. Менску.

Адняёміўшыся з лістом Маскоўскіх і Іванава-вазьнясенскіх комсамолак ад 6 і 12 студзеня гэтага году ў „Комсамольскай Праўдзе“, лічым, што такія-ж рэчы маюцца і на нашых заводах і фабзавучах.

У нас, калі выбіраецца бюро ячэек, дык дзяўчына высоўваецца туды не таму што яна можа працаваць як хлопец, а толькі як прадстаўнік „жаночага полу“.

У нас былі выпадкі калі тых дзяўчат, якіх вылучала бюро на раённую конфэрэнцыю ў якасьці дэлегатак, комсамольская ячэйка правальвала іх, пры чым хлопцы казалі, што і бяз „спадніц можна там абыйсьціся“.

Хлопец, калі ён стаіць каля аднаго варштату з дзяўчынаю, якая мае такую ж кваліфікацыю як і ён, і атрымоўвае такую-ж аплату дык лічыць гэта ніжэй свае вартасьці, таму што па яго думцы дзяўчына зьяўляецца больш нізкаю істотаю, і павінна менш атрымоўваць, як ён хлапец. Гэта іншы раз выклікае ў асобных комсамолак і дзяўчат працаўніц упадачны настрой і яна вельмі кепска пачынае адносіцца да комсамольцаў і ячэйкі.

Трэба сказаць, што іншы раз і партыйцы не адстаюць ад комсамольцаў.

Вось на фэрма-заводзе гавораць дзяўчатам комсамолкам „куды вы годны, калі будзе вайна дык усе ў пад печак палезеце“. Такія насьмешкі ня зьбліжаюць нас з комсамольцамі і партыйцамі, але іншы раз адпіхаюць.

Сярод хлапцоў заўсёды пачуеш лаянку, ўсякую пахабшчыну, а калі ім скажаш што так ня ддобра, яны адказваюць «Вось інтэлегентка нашлася, не падабаецца, можаш ня слухаць...

І ідзе іншы раз за гэтым лаянка а трэба сказаць, што ў гэтай справе іншы раз першую скрыпку граюць актывістыя.

Ня лепш як у Маскве абстаіць справа з замужнімі комсамолкамі.

Бываюць іншы раз такія выпадкі, калі асобныя дзяўчаты кепска адносяцца да сваіх абавязкаў і нават задзіраюцца, ім неабходна будзе даць пакаланьне, каб яны сябе лепш паставілі, каб яны больш зацікавіліся працай

Усё, што іншы раз бывае ў нас у ячэйках не апішаш, ды і ліст Маскоўскіх і Іванава-Вазьнясенскіх комсамолак аб усім гэтым сказаў. Мы лічым, што, у аснаўным, усё тое, што там напісана правільна. З усяго гэтага вывад, што наш райком павінен сур'ёзна заняцца пытаньнем аб дзяўчатах і мы прапануем райкому наступнае.

— Прапанаваць усім ячэйкам раёну каб яны прапрацавалі ліст у „Комсамольскай Праўдзе“ і вызначылі конкрэтныя мерапрыёмствы, па памяншэньню працы сярод дзяўчат, а калі райком атрымае матар'ялы з ячэяк, няхай распрацуе ўжо практычныя мерапрыемствы па раёну і нас пазаве яшчэ раз для таго, каб паталкавацъ з імі наконт гэтых мерапрыемств.

— Няхай Райком больш разварушыць ячэйкі, каб яны больш зацікавіліся пытаньнямі працы сярод дзяўчат, няхай яны ня толькі гавораць аб гэтым, а робяць.

Дзяўчаты-комсамолкі павінны сябе паставіць у ячэйцы так, каб з імі лічыліся ня толькі на словах, а і на справе.

Патрабаваць сабе працу і адносіцца да яе з поўнаю адпаведнасьцю, і выконваць яе.

—

Комсамолкі-работніцы Ляхаўскага раёну гораду Менску: з заводаў «Чырвоная Зорка» службы цягі Заходняй чыгункі, Менская школа вучнёўства, Хімфармзаводу, Цэнтрасьпірту, ФЗВ Гарбароў, «Мэталу».

Склікаем нараду замужніх комсамолак.

(Ліст з Бабруйску).

Чакаем матар'ялаў аб выніках гэтай нарады.

Ліст Маскоўскіх комсамолак, зьмяшчэны ў газэце „Комсамольская Праўда“ прыцягнуў увагу комсамольцаў да закранутых у ім пытаньняў. Аб гэтым цяпер гавораць у клюбах і ячэйках.

Запраўды, калі прыглядзецца да жыцьця замужняй комсамолкі, асабліва мацеры (хоць у пісьме гаворыцца наогул аб дзяўчынах), то ўбачыш шмат чаго ня добрага—адмоўнага, прычым, каб зьнішчыць маючыяся хібы мы пакуль што нічога не зрабілі, мы гэтым не займаліся, а бязумоўна, што тут можна многа чаго зрабіць.

У нас маюцца ячэйкі, дзе ёсьць па 12-15 замужніх комсамолак, у многіх маюцца дзеці. І вядома, што перад намі стаіць пытаньне, аб прыстасаваньні, як культурна-масавай, гэтак і ўсёй іншай працы да ўмоў, якіх знаходзяцца гэтыя таварышы

Як вопыт мы склікаем у Бабруйску нараду замужніх комсамолак, па пытаньням сямейнага быту, а так сама абгаварым ліст Маскоўскіх комсамолак.

Ізакаў.

„Прыгожая? Давай яе!“

(Нова-Беліца).

Дзявочых скарг у Нова-Беліцы шмат.

Ячэйкі мала давяраюць дзяўчатам адказную працу.

Вось прыклад: трэба на фабрыцы „Везувій“ вылучыць эконом-працаўніка колектыву. Есьць і падыходзячая дзяўчына, а вось чуеш —ячэйка кажа дзяўчыне „дай дарогу хлапцу“ і нагрузку даюць хлапцу.

Альбо, абіраюць кіраўнічы орган саюзу. Дзяўчат абіраюць не за іхнюю актыўнасьць, а дзеля запаўненьня модусу прадстаўніцтва ад дзяўчат.

— Каго?

— Сяргеенку?

— Прыгожая?

— Давай яе!..

Гэта ня рэдка пачуеш і на сходзе ячэйкі,

Ячэйкі надта слаба вядуць працу сярод дзяўчат-комсамолак якія павыходзілі замуж, і апошнія не адчуваючы комсамольскага ўплыву кідаюць комсамол.

Адсутнасьць працы сярод комсамолак, адхіляе ад уступленьня ў комсамол і беспартыйных маладых работніц.

Алесь Беларус.

Піонэрскі рух.

Яшчэ раз аб піонэрпрацы

(У парадку абгаварваньня)

Пашырай тэхнічныя веды.

Калі мы пагледзім за апошні час працу нашых атрадаў і прыслухаемся да настрояў піонэраў дык ўбачым, што больш усяго дзетвара захапляецца набыцьцём тэхнічных ведаў. Мы таксама назіраем што стыхійна організоўваюцца пры атрадах розныя тэхнічныя гурткі—радыё, модэлістаў, пераплётчыкаў, рукадзельля і інш. Калі гэта так, дык даўно пара думаць аб тым, як практычна організаваць такую работу. Некаторыя організацыі, напрыклад, Ляхаўская, гор. Менску ўжо зрабіла некаторую працу организаваўшы майстэрню. Але гэтага мала, ад нас патрабуецца больш.

Цяпер паўстае пытаньне, ці можна пры атрадах гораду і вёскі організоўваць такія гурткі. Мне здаецца, што організоўваць іх трэба не пры атрадах, а пры клюбах, школах і хатах-чытальнях, дзе іх няма—пры Чырвоных кутках. Як-жа быць тады з тэхнічнымі назвамі зьвеньняў, калі ў тэхнічныя гурткі пойдуць толькі тыя піонэры, якіх цікавіць гэтая праца і калі мы павінны працу атрадаў праводзіць па заданьням?

Думаю, што тэхнічную назву зьвеньняў трэба ліквідаваць бо гэта ўсё роўна нічога не давала і даваць ня будзе.

Ініцыятарам па організацыі тэхнічных гурткоў павінен быць піонэрскі атрад, пад яго кіраўніцтвам павінна праходзіць уся гэтая праца. Для кіраўніцтва трэба прыцягнуць ведаючага справу партыйца, комсамольца і бацькоў.

Наладзім досуг.

Цяпер некалькі слоў аб досугу піонэраў. Некаторыя павадыры атрадаў кажуць: як гэта вы можаце на зборы атрадаў даць некалькі вольнага часу, каб яны займаліся чым хочуць, у нас і так часу няма.

Вядома, калі добра ўдумацца у такую заяву дык гэта ўсё роўна што сказаць—лепш зусім не займацца вучотам запатрабаваньняў піонэраў, лепш мучыць іх палітсводкамі; альбо доўгімі надаедлівымі гутаркамі; якія піонэраў не цікавяць і якія ў выніку гэтага няходзяць на зборы атрадаў.

Трэба каб на кожным зборы атраду, зборы зьвяна быў час (пастанова 1-го пленуму Бюро ЮП ЦК ЛКСМБ) спэцыяльна адведзены для досугу. Што-ж будуць рабіць піонэры ў гэты час? Будуць займацца тым, што каму падабаецца.

Павадыру атраду трэба заранейклапаціцца, каб прадугледзець, што ад яго будзе запатрабавана піонэрамі. Трэба каб былі некаторыя матар'ялы, а то напрыклад, атрады Дзяржстраху (Менск) маючы дастаткова грошай ня выпісвае ні газэт ні часопісай. Да гэтага часу яшчэ ня дасталі памяшканьня для працы, а Дзяржстрахаўскаму атраду думаю што пакойчык у такім вялізарным будынку найці можна.

Піонэры ў гэты час могуць гуляць у шашкі, шахматы, чытаць жадаемыя апавяданьні, вершы, сьпяваць малявать, весьці паміж сабой гутаркі могуць іці катацца на каньках, лыжах і г. д.

Для сталай організацыі досугу усяго гэтага таксама мала. Можна організаваць усім атрадам катаньне на лыжах, санках каньках (калі гэтыя прылады есьць.) Організаваць вечар у атрадзе. Організаваць колектыўную паходку ў кіно, дагаварыцца з клюбам каб для дзяцей былі сэансы (паказаньне па прафілю ад ЦСПСВ дадзена). Памаймо нашы райбюро і ячэйкі комсамолу нічога яшчэ ня робяць у гэтым. Дырэктывы ЦК праламляюцца надзвычайна слаба.

М. Краж.

Ад рэдакцыі. Зьмяшчаючы артыкул М. Кража мы адчыняем у „Чырвонай Зьмене“ дыскусію па высунутых ім пытаньнях піонэрпрацы. Рэдакцыя просіць таварышоў прысылаць свае допісы. Вельмі пажадана, каб допісы больш за ўсё высьвятлялі вопыт праробленай працы і давалі прапановы, як правесьці практычна працу па закранутым пытаньням.

Больш цікавай працы ў піонэрскі атрад!

(Віцебск).

У шэрагу нашых атрадаў дысцыпліна ў апошнія часы значна аслабла. Наведваньне атрадаў самае нерэгулярнае. Аб гальштуку і яго значнасьці старэйшыя піонэры нават і слухаць ня хочуць.

За апошні час сталі прыкмячацца нават выхады з піонэрскай організацыі, напрыклад, у атрадзе Электра-Механічнага Тэхнікуму ў працягу двух месяцаў вышла больш 20 асоб, у атрадзе Т-ва Прыхільнікаў Дзяцей —3 асобы. Усе выходзячыя з атрадаў піонэры тлумачаць свае выхады адсутнасьцю цікавай працы ў піонэрскім атрадзе, не належным падыходам павадыроў да піонэраў, вялікай перагружанасьцю ў працы і г. д.

Абвінавачваць у гэтым толькі павадыроў нельга, бо яны ня маюць дастаткова паказаньняў, як разгарнуць працу. Акруговае і Раённае бюро кожны дзень абяцаюць прыслаць распрацованыя ЦБ заданьні, але абяцаньне мабыць і застанецца абяцаньнем, складаць-жа самастойныя пляны Раённае бюро ня раіць і гэтым самым падрываецца праца атрадаў.

Няма, зразумела, сумненьня ў тым, што нашы павадыры, ня маюць дастатковай падрыхтоўкі дзеля працы ў сувязі з узросшымі запатрабаваньнямі піонэраў, але ўсёцэла іх абвінавачваць у гэтым нельга.

Акруговым бюро юных піонэраў трэба ўлічыць усе гэтыя хворыя зьявішчы і ў хутчэйшым часе здаволіць піонэрпрацаўнікоў належнымі паказаньнямі ў іх працы, палепшыць працу піонэр габінэту,

ЯМФ.

Міжнароднае становішча

(Агляд за тыдзень)

Нарастаючы фашысцкі фронт на Захадзе.

Год таму назад рукамі ангельскага фашызму, палітыкай Чэмбэрлена быў зроблены фашысцкі пераварот Польшчы. Праз паўгода такі-ж пераварот быў зроблены ў Літве Фашызм стаў разгортваць сваю дзейнасьць на Захадзе.

Навакол СССР пачаў расьцягвацца фашысцкі фронт. Майскі пераварот Польшчы даў белапілсудзчыкаў. Па камандзе з Варшавы абэрпадручнага лёнданскага габінэту, польска-літоўска бела-эміграцкая ваеншчына зьнішчыла парламант, дэмократыю і конституцыю ў Літве, У сувязі з гэтым пачала расьці небясьпека фашысцкага перавароту ў Латвіі.

Першы крок ужо зроблен. 21 га студзеня ў 5 гадзін раніцы ў горадзе Вольмары (Латвія) была зроблена спроба зрабіць фашысцкі пераварот. Лейтэнант Олін на чале атраду з 40 салдат захапіў пошту, тэлеграф і чыгуначную станцыю Гайназ на Сьмільтанскай лініі. Паўстаньне было хутка падаўлена ўрадавымі войскамі і абвінавачаныя перададзены вайсковаму суду.

Гэроям спробы фашысцкага перавароту ў Латвіі аказаўся лейтэнант Олін, які раней быў прапаршчыкам царскай арміі, а пасьля рэволюцыі быў калчакоўскім афіцэрам. Пасьля разгрому Калчака Олін скончыў вайсковую школу ў Латвіі, дзе і працаваў да гэтага часу.

Спрабуючы зьвясьці фашысцкую вылазку, у п'яны ўчынак, латвійскі вайсковы міністр даў прадстаўнікам друку наступнае тлумачэньне: „сягоньня паміж 5 і 6 гадзінамі раніцы лейтэнант 8-га Дзьвінскага палку на чале атраду 40 салдат накіраўваўся з мястэчка Кугэрмуня ў горад Вольмар. Прыбыўшы ў Вольмар, атрад заняў тэлефонную станцыю і ўпраўленьне чыгункі. Аб гэтым было апавяшчэно камандваньню палка, якое паслала ў Вольмар атрад войск, на чале з батальённым камандзірам. Мяцежнікі арыштаваны. У горадзе ўстаноўлен парадак“.

Кантон не паддацца.

Рускія буржуазныя газэты пацьвярджаюць, што спрабаваўшыя зрабіць пераварот лейтэнант быў п'яны і называюць падзеі ў Вольмары „учынкам п'янага афіцэра“.

Але-ж на справе ня так. Тэлеграфнае агэнтства (ТАСС) паведамляе, што падзеі ў горадзе Вольмары больш чым п'яны ўчынак, а што гэтыя падзеі рабіліся па вядомаму пляну, якія цяпер з-за няўдачы правваліліся.

Фашысцкая небясьпека расьце. Яна расьце ў Латвіі і другіх краінах. Вольмарскія падзеі гавораць яшчэ раз пролетарыяту ўсіх краін аб тым, што барацьбу супроць капіталу наогул і супроць фашысцкай рэакцыі ў прыватнасьці трэба цяпер узмацніць.

Імпэрыялізм спрабуе задушыць рэволюцыйны Кантон

Рэволюцыя перакідаецца за межы рэволюцыйнага Кантону, ў провінцыі якія знаходзяцца пад уладаю контррэволюцыйных генэралаў.

У Шанхаі на тым тыдні забаставалі ўсе рабочыя ангельскіх концэсій, дзякуючы чаму праца на ўсіх прадпрыемствах была спынена.

Ангельскі імпэрыялізм спрабуе і падрыхтоўвае выступленьне з аружжам у руках супроць кітайскай рэволюцыі. З Пекіна паведамляюць, што ў кітайскіх колах даказваюць, што Ангельшчына рыхтуецца да ўзброянай інтэрвэнцыі ў Кантоне, а магчыма і да вайны

Вядома, што ўзмацняючы ваенныя сілы ў Кітаі, ангельскі імпэрыялізм аб'ядноўваецца з сусьветным імпэрыялізмам да рашучых падзей Кітаю. З Лёндану агэнцтва «Рэйтэр» паведамляе: што 4-м батальёнам дадзен загад быць падрыхтованым да адпраўкі з Ангельшчыны ў Кітай. Тое-ж агенцтва паведамляе, што два ангельскія палкі, якія расквартыраваны ў Мальце атрымалі загад быць гатовымі да выступленьня ў Кітай. Есьць весткі, што замежныя дзяржавы падрыхтавалі да высадкі 5300 замежных салдат. У розных пунктах Шанхаю будуюцца жылыя памяшканьні вялікіх разьмераў, якія прызначаюцца для расквартыраваньня замежных вайсковых сіл.

Вось як цывілізаваная Ангельшчына думае расправіцца з кітайскім народам.

У міністэрстве замежных спраў Паўночных Амэрыканскіх Злучаных Штатаў зазначаюць, што падрыхтоўваецца эвакуацыя ўсіх амэрыканскіх грамадзян з унутраных раёнаў Кітаю апрача таго падрыхтоўваецца адпраўка дадатковых вайсковых марскіх сіл Паўночна-Амэрыканскіх Злучных Штатаў у Кітай.

Імпэрыялізм усяго сьвету рыхтуецца задушыць рэволюцыйны кітайскі рух, але гэта яму ня ўдасца.

М. Х—віч.



Патрэбен дзіцячы клюб

(Нова-Беліца, фабрыка „Везувій“.

У нас вядзецца так: калі комсамолец ня мае ніякай нагрузкі, ці наогул адлыньвае ад працы, дык яго накіроўваюць на піонэрскую працу. Нам трэба падбіраць такіх павадыроў, якія маглі-б добра організаваць унутраную працу атраду, якія былі добра палітычна-адукаваны. Трэба каб павадыр атраду праводзіў не толькі розныя палітычныя гутаркі, але і мог-бы падаць ініцыятыву да організацыі тэхнічных гурткоў і мог-бы ўвесьці ўвесяліцельныя моманты ў працу атраду, бо яны неабходны.

Пара ўжо пачаць рашучую барацьбу за дзіцячыя клюбы, а то у нас іх і да гэтага часу яшчэ няма.

І. Малашэнка.

Комсамольцаў—у сельсаветы!

Перавыбары сельсаветаў у поўным разгары. Сяляне гарою стаяць за лепшых комсамольцаў.

Юнвяскоры! Пішэце аб конкрэтным удзеле моладзі ў перавыбарах сельсаветаў.

„КАБ СЕЛЬСАВЕТ ДЫ З АДНЫХ КОМСАМОЛЬЦАЎ.

(Бабруйскі сельсавет, Жлобінскі р., Бабруйская акруга)

З падрыхтоўчай працы да перавыбарнай кампаніі па Бабруйскім сельсавету галоўнае месца занялі сходы беднаты, якія праводзіліся па усіх вёсках.

Пры абгаварваньні сьпісу кандыдатур у новы сельсавет, сярод якіх былі 3 комсамольцы, адзін дзядзька сказаў:

— „Каб увесь сельсавет складаўся з адных комсамольцаў, дык тады-б і праца была добрай“.

У сёлетніх перавыбарах жанчыны і дзяўчаты прымалі параўнаўча актыўны удзел. Напрыклад на перавыбарах вучастку Лугавая-Вірня жанчын было 45 проц. усіх прысутных.

У склад новага сельсавету прашлі 3 комсамольцы, 2 комуністы, 2 жанчыны (адна з іх комсамолка).

Таварышы, якіх раілі у сельсавет сходы беднаты прашлі на 80 процантаў.

А. Акінчыц

Пры добрым сельсавеце—кіпіць праца

Моладзь—пачынальнік карыснай справы

З чаго трэба пасмяяцца?

(Перавыбарныя малюнкі)

— Гэй, Максім... ці чуеш?—Хадзем перазьбіраць начальства!—барабанячы кіёчкам па вакну клікаў Лявон свайго суседа.

— Зараз-зараз! Хай жонка апранецца... вось ідзем ужо!—чуўся адказ з хаты.

На дарозе Лявон сьмяяўся з Максіма:

— І чудак ты, Максім, дальбог чудак! Навошта ты жонку цягнеш? Што ёй працы няма, што?

А хіба твая Магдалена «бязгласная» ці не паклікалі яе пісулькай?—цікавіўся Максім.

— Ого! у яе галасок, дай бог здароўя! Але я ўзяў даручэньне ад жонкі і ад дзяцей падымаць рукі і за іх.

Дык колькі-ж у цябе галасоў?

Шэсьць будзе.

* * *

— Таварышы! Дазвольце адчытацца... Цэлы год служыў... Выбралі мяне вы, пытаюся?—Выбралі. Давярэце мне!—Выходзіць. Так што няма мне чаго і адчытвацца..,

Старшыня сходу: —давайце пытаньні.

— Чаму капяраціву не зрабіў?

— Калі дровы паедам сякчы?

— А як з пасёлкамі?

— Чаму сельсавет ня даў насеньня беднаце?

— Агапіна кабыла нагу зламала на мосьце. Чаму ёй не дапамаглі узараць на зіму? . . . .

. . . . . .

Старшыня сельсавету адказвае на запытаньні:

— Я буду вельмі кароткім:

— Капяраціў адчынілі, нават марміладу купілі, але няма чым важыць—вясоў няма. Вось таму і капяраціў ухіляецца ад працы;

На які бес вам дровы? Хутка вясна...

Каму хочацца на пасёлкі—пажалуста, я ухіліў у гэты бок пазбаўлен.

Што я вам дойная карова? Самім трэба мець насеньне;

Пры чым тут сельсавет, калі Трахім усьпёр сваю кабылу на паломаны мост.

Бядняк—кулацкім сынкам.

* * *

Юнвяскор з вёскі Заўшычы (Случчына) піша:

Перавыбары пачаліся. Комсамольцы бяручы на ўвагу вялікую міжнародную важнасьць саветаў у дзеле вызваленьня працы ад капіталу, у дзеле замацваньня заваёў гаспадароў машын і фабрыкаў, горача выконвалі задачы нашай слаўнай партыі. Калі мы летась нічога не зрабілі, дык сёлета прымалі актыўны ўдзел у падрыхтоўчай кампаніі. Моладзь была разам з комсамолам. Наогул перавыбары прашлі добра.

А што конкрэтна зроблена комсамольцамі ў перавыбарнай кампаніі, якія даваліся моладзьдзю наказы новаму сельсавету—да гадвайцеся самі, паважаныя рэдактары. Гэта ў абавязкі Заўшыцкага юнвяскора, відаць не ўваходзіць!

З Паваротны.

Чаму моладзь ня цікавіцца клюбам?

У КЛЮБАХ СУМНА, НЯМА ЖВАВАЙ, ПРЫВАБЛІВАЙ ПРАЦЫ!

На сталох ляжыць старая літаратура. Сьвежых газэт няма. Адсутнічаюць забавы.

Няма цікавасьці зьбірацца.

Нова Беліца, фабрыка „Везувій“.

На кухні шум. Гэта работніцы прышоўшы з працы звычайна гатуюць сабе абед. Хто крычыць гаршчок вывярнуўшы, хто блін спаліўшы лаецца...

Але праз некалькі гадзін гэтага шуму ў абшчажыцьці ня чутно. Усе работніцы разыходзяцца па сваіх пакоях. Надыходзіць час адпачынку. Тут усе работніцы зьбіраюцца седзючы на ложках у гурткі і пачынаюць праводзіць працу па зьнішчэньню... семачак.

Бязумоўна, што ў гэтым ні адна з работніц не вінавата.

Маецца ў нас Ленінскі куток, аднак зьбірацца ў ім няма аніякай цікавасьці. Няма ў ім нічога такога, што зацікавіла-б нашу работніцу. Літаратуры няма, толькі некалькі часопісаў на стале ляжаць, ды й на іх ужо даўно абрыдла глядзець. Сьвежых газэт аніколі і ня знойдзеш, няма таксама і сваёй насьценнай газэты.

А нашаму фабкому даўно трэба было-б зьвярнуць на гэта сваю фабкомаўскую ўвагу.

ГАННА.

Два калы паміж сьпіц.

СТ. ДРЭТУНЬ, ШКЛЯНАЯ ГУТА „ТРУДЫ“

На шкляной гуце „Труды“ працуе звыш 600 рабочых, а з гэтага ліку больш за 200 чалавек — рабочы маладняк.

Культурнай працы сярод нашай рабочай моладзі няма.

Клюб адсутнічае. Заместа яго — хата-чытальня з шашкамі на тым-жа стале дзе і газэты. Тут жа чуваць у махорачным дыме „мат“ ня шахматны... а аматарскі...

Няму чаму дзівіцца, калі дарослыя рабочыя ісьці ў хату-чытальню ня хочуць, а моладзь прыходзіць толькі семачкі палузгаць ды „пабузіць“. Вось гэта і дае повад казаць нашым заводзкім організацыям, што і клюбу няма чаго будаваць — усё роўна ня пойдуць.

Гэта-ж казаў і прадстаўнік ЦК саюзу хэмікаў т. Грыгорь'еў на просьбу рабочых.

А гурткам комсамольскім, партыйным, профэсыянальным няма дзе займацца. Хата-чытальня па вечарох зачынена—бо электролямпачак няма.

Выйсьцяў з гэткага становішча маецца шмат: ці пабудаваць клюб, ці абмяняць памяшканьне хаты-чытальні на большае, альбо ў канцы канцоў хаця-б абсталяваць лепш і сучасную хату-чытальню.

Ды яшчэ адна бяда у нас: няма інструктара па спорту. А спортпрылады-марнуюцца у заўкоме цэлы год.

Комсамолец.

Чаму?

(СЛУЦК).

Доўгі час у нас у горадзе зусім ня было комсамольскага клюбу, аднак цяпер клюб адчыніўся, у ім цёпла, шмат сьвятла, а наведваньне зусім адсутнічае.

Чаму?

Тлумачыцца проста:

Папершае клюб не здавальняе запатрабаваньняў шырокай масы рабочай моладзі, а падругое у ім адсутнічаюць забавы для моладзі.

Хаця-ж і на паперы пры клюбе організаваны цэлы шэраг гурткоў, але на справе аніводзін з іх ня існуе.

У клюбе не праводзіцца чытка мастацкай літаратуры, не наладжваецца гульня ў політфанты. А два гады таму назад гэта праводзілася.

Праўленьне клюбу павінна сур'ёзна падумаць аб ажыўленьні працы нашага клюбу.

А. Б.

АД РЭДАКЦЫІ: У хуткім часе на старонках „Чырвонай Зьмены“ будуць высьвятлены формы і мэтады працы цэнтральнага комсамолькага клюбу імя КІМ у якія бязумоўна можна будзе праўленьням і іншых комсамольскіх клюбаў скарыстаць у форме вопыту.

Практычны пачынак.

Можаце скарыстаць вопыт. (Мазыр).

Гэтымі днямі быў закончаны рамонт мазырскага клюбу ім. КІМ. У адным з пакояў клюбу абсталёваны вытворчы куток будаўнікоў. У кутку адбіваецца мясцовая вытворчасьць саюзу будаўнікоў.

Неабходна і іншым вытворчым ячэйкам прыняць удзел у пашырэньні нашага вытворчага кутку экспонатамі сваёй вытворчасьці. А ў выніку можа ўтварыцца маленькі музэй акруговага значэньня, у якім будуць сконцэнтраваны усе галіны прамысловасьці Мазыршчыны.

І паглядзець будзе цікава і павучыцца таксама будзе чаму. А скарыстаць наш вопыт можна і іншым акруговым комсамольскім клюбам.

Х. САФ'ЯН.

Хутка пачынаюцца акруговыя конфэрэнцыі ЛКСМБ.

КОЖНАЯ ВАКРУГА ПАВІННА ПАДЗЯЛІЦЦА ВОПЫТАМ ПРАЦЫ.

ПЕРШАЕ СЛОВА ДЛЯ АБМЕНУ ВОПЫТАМ І ПРАПАНОЎ АТРЫМОЎВАЕ МАГІЛЕЎШЧЫНА.

Што конкрэтна праароблена?

Перад Комсамолам ва ўсю шырыню гаспадарчае пытаньне стала пасьля сакавіцкага пленуму ЦК і ЦКК.

І мы маем дасягненьні з комсамольцамі гаспадарамі амаль што ва ўсіх раёнах праводзілі паасобную работу. Акрамя нарад самастойных гаспадароў, праведзена нарада з бацькамі (Бялынічы) і адна нарада пры Акругкоме. У выніку: наліччa кульцівізацыі. Амаль усе гаспадаркі, дзе гаспадараць сябры комсамолу, сеюць канюшыну, часткова робяць кармушкі.

Некаторыя гаспадаркі (Тарасенкі, Мінчукова, Сафронава, Дамоўскага) становяцца культурным асяродкам для сялянства. Тут, побач з вядзеньнем шматпольнага севазвароту, мы маем досьледы (Міхась Тарасенка вымочваньне насеньня вытвараў яшчэ ў мінулым годзе).

Будуем кооперацыю.

Лупалаўская Райорганізацыя Комсамолу, у час трохмесячніка кооперацыі, навербавала каля 700 пайшчыкаў, а адна Галоўчынская ячэйка (Бялынічы)—100. Сакратар Варава-Будзкай ячэйкі даў—110, а шэраговы сябра комсамолу—80 новых пайшчыкаў.

А Струкачоўская і Абідавіцкая ячэйкі стварылі кооперативы, організавалі вакол гэтага пачынаньня насельніцтва, якое даручыла кіруючую работу ў кооперацыі комсамольцам.

Макранская ячэйка (Быхаў), праз Камітэт Узаемадапамогі, кооперывала 32 беднякоў.

Там дзе працуюць комсамольцы.

Комсамольцам Задубскай ячэйк падрыхтавана да стварэньня крахмальна-патачная арцель з 30 бядняков. Па пачынаньню Макранскай яч. насельніцтва пракапала канаву на $1^1/_2$ версты. Макранскі Камітэт Сялянскай Узаемадапамогі, якім кіруюць комсамольцы, павялічыў свой фонд з 32 рублёў да 200 з лішкам. Струкачоўскі стаў на ногі і ў ём зьявіліся 4 машыны. Зьявілася машына і павялічыўся фонд у Журавіцкім Камітэце Узаемадапамогі.

* * *

Але-ж да гэтага часу значная частка вясковых ячэек да „канкрэтнай справы“ не падышлі, круцяцца ў сусьветных пастановах

К часу акруговай конфэрэнцыі перад кожнай вясковай ячэйкай павінна стаць ва ўвесь рост—гаспадарча-грамадзкая работа, стрыжань ўсяе работы ячэйкі.

Райкомам трэба ня толькі глядзець і зьбіраць вопыт, але ж і конкрэтна кіраваць гэтай справай.

Трэба раўняцца, напрыклад па Карме. Райком па справаздачы Расохскай ячэйкі, ёй прапануе: „сумесна з парт'ячэйкай распрацаваць мерапрыемствы па організацыі льнаводнага таварыства ў вёсцы Лужок“.

* * *

Яшчэ некалькі прапаноў.

Накіраваць машыну у веску.

Мы да гэтага часу востра пытань не аб праштурхваньні машыны ў вёску ня ставілі. А машына, адзін з шляхоў колектывізацыі сялянскай гаспадаркі. Наша вясковая ячэйка павінна быць у пачынаньні па стварэньню машынных таварыстваў. Кожны самастойны гаспадар-комсамолец павінен быць першым сябром гэтых таварыстваў. Трэба і як небудзь знайці 5 рублёў на гэту справу:

Першае таварыства стварае Макранская ячэйка.

Аб грамадзка-агнястойкім будынку.

У нас лесу не хапае. Мы агітуем за лес, у большасьці, у „Дзень лесу“. Кажам мы больш усяго аб захаваньні лесу, аб правільным скарыстаньні, але ж усім мала аб тым каб яго менш выдаваць.

Неабходна разгартваць работу, у большасьці праз КСУД, за організацыю таварыстваў па выпрацоўцы чарапіцы і бятону. Трэба адначасова, каб комсамолец самастойны гаспадар меў гліна саломеную страху. Трэба, каб па пачынаньню лепшай вясковай ячэйкі Комсамолу, был пабудован насельніцтвам грамадзкі агнястойкі буднак.

Увага комсамольцу-прыказчыку

Па нашай вакрузе ў вясковых спажывецкіх кооперативах 34 комсамольцы - прыказчыкі. Не кажучы ўжо аб увазе ячэйкі да працы прыказчыка, мы маем шмат момантаў падседжваньня іх;“ „яны грошы атрымліваюць“. Побач з пастаноўкай пытаньня аб прыкладнасьці комсамольца-прыказчыка мы ставім пытаньне аб увазе, аб дапамозе яму з боку ячэйкі і Райкому.

Жывёлаводчаскі ухіл у комсамольскіх гаспадарках.

Прыказка „для добрай жывёлы—добрыя грошы“—маемасьць усіх самастойных гаспадароў. Маючыяся дасягненьні ў іх гаспадарках, жывёлу не зачапілі.

Ва ўсю шырыню трэба паставіць перад імі пытаньне аб палепшаньні маючайся жывёлы, увязаўшы гэта з збяражэньнем харчы і большым прыбытку ад жывёлы.

Кармушка, караньплоды уцяплёны хлеў—павінны быць у тых сялянскіх гаспадарках, дзе маюцца комсамольцы.

* * *

Галоўнае з галоўных—што неабходна папярэдзіць у грамадзка гаспадарчай справе кожнай ячэйкі, гэта гарачнасьць у выкананьні намечанага, не даводзячы начатае да канца. Трэба паменш гарачнасьці — больш сталасьці і ўпартасьці.

Г. Фалкін.

К. Дагура.

Саюзныя навіны

У „ЦК УсеЛКСМ“,

Усіліць вярбоўку дзяўчат

За час з 1-га студзеня 1926 г., калі ў нас у арганізацыі было 20,6% дзяўчат, мы дасяглі некаторых посьпехаў у справе прыцягненьня дзяўчат у Комсамол, і зараз у саюзе налічваецца з 2.200.000 комсамольцаў 405.839 дзяўчат.

У сувязі з малым процантам дзяўчат у саюзе і ў сувязі з надыходзячым міжнародным жаночым днём, ЦК УсеЛКСМ пастанавіў усіліць вярбоўку дзяўчат у саюз.

У „шэрагі „лабкораў“

ЦК УсеЛКСМ зьвярнуўся да ўсіх арганізацый ЛКСМ са спэцыяльным лістом па поваду дапамогі мясцовых арганізацый сялянскай сельска-гаспадарчай лябараторыі пры газэце «Беднота».

У лісьце, паміж іншым, указваецца, што сумесная праца сялянскай сельска-гаспадарчай лябаторыі „Бедноты“ і яе корэспондэнтаў („лабкораў“) ужо цяпер дала надзвычайна цікавыя вынікі. „Лабкоры“ па паказаньням лябараторыі выканалі цэлы шэраг вопытна-дасьледчых прац буйнага гаспадарчага значэньня. Калі далейшай праверкай вынікі гэтых прац пацьвердзяцца, дык сялянства нашага саюзу атрымае новыя, простыя і прытым усім надоськава даступныя способы значнага (на 30-50 проц.) павялічэньня і паляпшэньня ўраджаю. У сучасны момант сялянская лябараторыя вядзе падрыхтоўчую працу да гэтых праверачных вопытаў.

ЦК УсеЛКСМ прапануе усім арганізацыям, усім вясковым ячэйкам УсеЛКСМ: пачаць кампанію за уцягваньне комсамольцаў у працу „лабкораў“, скарыстоўваючы для гэтай мэты комсамольскі друк, комсамольскія газэты і часопісі, комсамольскія аддзелы сялянскіх газэт, інструктароў, раённыя і акруговыя конфэрэнцыі і г. д.

Вучнёўства ня будзе „бяспрытульным дзіцём“.

На прадпрыёмствах арганізуюцца камісіі па вучнёўству.

Наркампраца арганізуе на дзяржаўных прадпрыемствах БССР камісіі па вучнёўству.

Камісіі ўтвараюцца на фабрыках і заводах з лікам рабочых ня менш 100 чал.

Ранейшыя экспэртныя камісіі застануцца толькі пры саюзах для абслугоўваньня вучнёўства дробных прадпрыёмстваў. Таксама экспэртныя камісіі захоўваюцца пры фабзавучах.

Рыхтуйцеся да краязнаўчага зьезду.

Школьныя гурткі, дасылайце матар'ялы.

Школьна—краязнаўчая камісія Інбелкульту прапануе акруговым і раённым краязнаўчым таварыствам прысылаць у ЦБК (Менск, Рэволюцыйная, 21) весткі аб школьных краязнаўчых гуртках, колькасьці сяброў, праробленай імі працы і г. д.

На ўсебеларускім краязнаўчым зьезьдзе, які адчыняецца 10-га лютага, будзе стаяць даклад аб краязнаўстве ў школе, а таксама будзе наладжана выстаўка школьных краязнаўчых экспонатаў.

Мясцовыя краязнаўчыя таварыствы і школьныя гурткі павінны прыслаць матар'ялы, характарызуючыя краязнаўчую працу вучняў і дзяцей дзеля скарыстаньня на выстаўцы.

Аб усім.

▣ 180 дактароў выпушчае ў гэтым годзе мэдфак БДУ.

▣ 400 гурткоў кройкі і шыцьця ўтворана па БССР для работніц і сялянак пры дапамозе жаночага аддзелу ЦК КПБ.

▣ Пісьменік Зарэцкі піша раман „Сьцежкі дарожкі“.

▣ Маладняковец Кляшторны здаў ў друк зборнік вершаў „Кляновыя завеі“.

▣ Поэта Гурло падрыхтаваў да друку зборнік вершаў „Зоркасьць“.

Дыскусія.

Артыкулам Зэя. Штэймана, „Красная газэта“ (Ленінград) распачала дыскусію на тэму „Пісьменьнік і чытач“.

„Белыя зданi“.

Адно з апошніх апавяданьняў М. Чарота „Белыя зданi“ перакладжана В. Кузьмічом на украінскую мову і выдрукавана у № 1 часопісі «Плужанін»—1927 г. („Білі примари“).

Ліст у рэдакцыю.

Экономкамісія Менакругкому адказвай.

На конфэрэнцыі рабочай моладзі, якая нядаўна адбылася у Менску, выступіў делегат працколективу металістых і заявіў, што у іх у такарным цэху вучні больш году сядзяць на першым разрадзе і што наогул навучаньне вучняў пастаўлена кепска. Адміністрацыя колективу нічога у гэтай справе ня робіць.

Там жа на конфэрэнцыі тав. Шнэйдэр (стар. экономкомісіі Менакругкому) абяцаў высьветліць гэтае пытаньне.

Вучні гэтага працколективу паведамілі у справачнае бюро клюбу КІМ'у аб тым, што да гэтага часу т. Шнэйдэр свайго абяцаньня ня выканаў.

Пытаем праз «Чырвоную Зьмену» што думае т. Шнэйдэр зрабіць для урэгуляваньня гэтага пытаньня.

Дзяжурны справачнага бюро клюбу ім. КІМ З. ДАВІДОВІЧ.

Адказваю

Азнаёміўшыся з лістом т. Давідовіча у рэдакцыю «Ч. З.» пра невыкананьне майго абяцаньня вывіць пытаньне аб вучнеустве у арцколективе металістаў—адказваю:

Папершае—старшыня фабкому і загадч. упраўленьня працколективам металістых заявілі мне, што да пераходу у новае памешканьне працколективу пытаньне гэта ня можа быць урэгулявана.

Падругое—пасьля конфэрэнцыі АК паслау мяне зрабіць досьлед Смалявіцкай арганізацыі, дзе я і знаходзіўся да гэтага часу.

У пятніцу 28 студзеня экономкамісія АК паслала асыстэнта працы т. Зэліксона дзеля выяўленьня пытаньня аб вучнеустве у працколективе металістых.

Шнэйдэр.

Запытаньні і адказы

Запытаньне № 781 (Сель-к-ца) Ці адпушчаны сродкі для поўнага снабжэньня лікпунктаў?

Адказ. На кожны лікпункт адпушчана каля 62 рублёў, на якія трэба купіць лемантары, алоўкі, паперу і г. д.. але гэта недастаткова. Неабходна зьвярнуцца за дапамогай да існуючых ячэек Т-ва „Прэч няпісьменнасьць“ і к іншым арганізацыям.

Запытаньне № 782. (С. К.) Што павінна рабіць ячэйка, калі ў яе склад уваходзяць маладукаваныя комсамольцы, якім не пад сілу выконваць некаторыя комсамольцы працы (тэхсакратара, загадчык АПА і інш)?

Адказ. Такіх таварышоў можна скарыстаць на другой працы, якая-бы іх зацікавіла і была-б ім пад сілу. Напрыклад, на працы ў сельсавеце, у камітэце ўзаемадапамогі і інш.

Запытаньне № 783 (К.) Ці мае права комсамолец, якому яшчэ няма 18 гадоў, галасаваць на выбарах сельскага савету?

Адказ. Ня мае права.

Запытаньне № 784 (Шапіро З.) Чаму „Чырвоная Зьмена“ уздаражэла з 25 кап. на 65 кап.?

Адказ. Гэта няправільна. „Чырвоная Зьмена“ каштуе у месяц 25 кап. Але з дадаткам часопісі „Маладняк“ яна каштуе 65 кап.

Запытаньне № 785 (Гарошка) Ці можна рыхтавацца для паступленьня ў вучэбныя ўстановы Беларусі на 1927—1928 навучальны год па програме 1926—1927 навучальнага году?

Адказ. Можна, бо новая програма асабліва ня будзе адрозьнівацца ад старай.

Організуем масавае наведваньне Дзяржтэатр[у]

Агульнадаступныя спэктаклі для працоунай моладзі Менску

Рэдакцыя «Чырвонай Зьмены» сумесна з цэнтральным комсамольскім клюбам імя КІ[М] пры згодзе з дырэкцыяй БДТ І

організуе шэраг спэктакляў для моладзі (50 проц. скідкі).

Першы спэктакль адбудзецца ў сераду 16 лютага: пойдзе „ПЕРАМОГА“. П'еса з нядаўняга мінулага Са[вец]кай Беларусі ў 4 дзеях (19 образох)

Кошт білетаў—ад 75 да 20 кап. Білеты прадаюцца: днём у рэдакцыі газэты „Чырвон[ая] Зьмена“ (Комсамольская вуліца, № 25), а вечарам у клюбе „КІМ“. Таксама можна атр[ым]аць білеты праз юнсэкцыі. Астатнія білеты з 15-га лютага ў касе БДТ.

Ячэйкі, райкомы, юнсэкцыі—за працу па распаўсюджваньню білетаў у тэатр!

Рабочая і вучнеуская моладзь—у тэатр!

ПЕРШЫЯ КРОКІ МАЛАДОГА ТЭАТРУ.

„У мінулы час“, „Сон у летнюю ноч“, Цар Максімільян“ і „Астап“.

(Ад нашага Віцебскага корэспондэнта).

За час сваёй працы ў Віцебску 2-гі Белдзяржтэатр паставіў 4 вышэйпамянёныя п'есы. Кожны, хто бачыў гэтыя пастаноўкі можа ўпэўнена сказаць, што, бязумоўна, другім Белдзяржтэатрам прароблена вялікая праца і—недарма.

Асноўнае дасягненьне тэатру, на наш погляд, гэта—пераход на новыя формы тэатральнай працы (новая трактоўка, конструктывізм у дэкорацыях і інш.), што асабліва прыкметна ў пастаноўцы „Цара Максімільяна“.

— БДТ2, паказваючы з аднаго боку нашу беларускую вёску („У мінулы час“ і „Астап“) незапамятвае даваць класычныя творы („Сон у летнюю ноч“—Шэкспіра) і разам з гэтым дэмонструе зусім новыя прыёмы пастаноўкі (Цар Максімільян“).

З гэтых 4-х пастановак трэба лічыць найбольш удалай п'есу „Сон у летнюю ноч“. Праўда, тут мала зьместу, мясцамі глядач не разумее „куды гэта ўсё хіліцца“, але з боку пастаноўкі п'еса „Сон у летнюю ноч“ зроблена надзвычайна добра. Нябачымыя качэлі, лясныя эльфы, мастацкія дэкорацыі, казачная гульня—усё стварае надта добрае ўражаньне.

Найлепшай па зьместу, на наш погляд, зьяўляецца п'еса „Астап“, якая між іншым сваім сюжэтам вельмі напамінае кіно-стужку „В угаре нэпа“.

Найбольш удалася першая дзея, дзе дзецца сапраўдны твар нашай сучаснай вёскі.

Мела б вялікую каштоўнасьць па свайму зьместу (прыгоннае жыцьцё) п'еса „У мінулы час“, але тэма занадта слаба апрацавана аўтарам І. Бэнам; пастаўлена п'еса ня вельмі добра і дзеля гэтага посьпехам не карысталася.

П'еса «Цар Максімільян»—гэта першая студыйная праца маладога тэатру і ёй мы больш, чым у іх другіх пастаноўках бачым пастаноўку, якая адпавядае новай, левай плыні ў нашым тэатры. Тут і добрая гульня, і сьпевы і балет і акрабатыка і новыя ў канструктыўным духу дэкорацыі і інш. Яшчэ што вельмі добра ў гэтай п'есе—гэта тое, што ў ёй шмат фальклёру — беларускіх абрадавых сьпеваў і скокаў.

Гульня артыстых наогул ува ўсіх п'есах добрая. Адчуваецца, што кожны артысты на сваім месцы і добра вывучыў сваю ролю, папрацаваў над ёю.

Вельмі добра сыграўся оркэстр тэатру, пад кіраўніцтвам Ільлі Гідгарда („Сон у летнюю ноч“, „Цар Максімільян“).

Наогул можна сказаць, што другі Віцебскі Белдзяржтэатр на правільным шляху. Тэатр у сваёй працы не абмяжоўваецца маючыміся дасягненьнямі, ён ідзе наперад, шукае новыя мэтады працы, каб не адставаць ад нашай сучаснасьці. І яму мы жадаем у далейшым такой-жа плённай працы.

К. Таўбэ.

Вясёлыя радкі.

Перавыбарнае.

— За што цябе вывелі з выбарнага сходу?

— Пад мухай быў, ня памятую... здаецца за каўнер.

„На вышыні“.

— У гэтай насьценгазэце прачытаць нічога нельга—вельмі вісіць высока.

— Ну, вось, і зразумей тут! Самі-ж крычалі—чаму насьценгазэта не на вышыні?!

Дараг'я.

— Ты чаго-ж, Васілёк, рэвізійную камісію лаеш, а сам кажаш ім: „дарагія таварышы!“.

— А як-жа не дарагія, калі адно частаваньне мне палтара чарвяка каштавала!

На ногі

— Мяне, ведаеш, РСІ на ногі паставіла!

— РСІ? Якім чынам?

— Вельмі проста: пазбавіла ад казённага аўтамабіля!

Фабрычна-завадзкія сямігод[кі]

ЦК ЛКСМБ унясло на разьгляданьне Наркамасьветы проэкт арганізацыі [у] Беларусі фабрычна-завадзкіх сямі[го]дак.

Істотнасьць гэтых сямігодак [за]ключаецца у тым, што вучні іх (...) дучы дзяцьмі рабочых якой небуд[зь] адной буйнай фабрыкі змогуць ц[алка]м зьвязаць сваю вучобу з гра[ма]дзкай працай свайго прадпрыемст[ва].

Суд.

Баран падвёў!

Надыходзілі каляды, а грошай Міхаліны Несьцяровіч ня было. Доў[га] думала яна над тым, як-бы каго [не]будзь „ачысьціць“ і нарэшце па[й]шла, што лепш усяго пайсьці з[ноў] на рынак. Там праўда, хутчэй мо[ж]на „засыпацца“, але за тое „св[ая] шпана“ можа выратаваць...

Несьцяровіч толькі тыдзень та[му] назад вышла з ДОПР'у. Але гэта што?.. Несьцяровіч махнула рукой, накінула на галаву хустку і паш[ла] на рынак.

Доўга хадзіла яна паміж вазо[ў], пакуль ня ўбачыла спакойна драм[аў]шага барана, якому даверлівы гас[па]дар даручыў берагчы каня і воза.

Хутка вызначыла Міхаліна пл[ан] дзейнасьці.

Спрытна сьцягнула з возу мяшо[к], выкінула сена і ўспіхнула туды б[а]рана. Ускінула на плечы і панясла.

Адышоўшы некалькі крокаў, я[на] ўбачыла гаспадара, які соладка з[а]цягваўся „цыгаркай... Хацела бег[чы], але тут баран чаму сьці моцна з[а]роў і... выдаў зладзейку.

На судзе селянін растлумачы[ў], што ён свайго барана па гол[асе] спазнаў, калі Несьцяровіч пранес[ла] яго міма схаванага ў мяшку.

Сьведкі паказалі, што Несьцяр[о]віч ведаюць, як профэсыйную з[ла]дзейку, якая заўсёды зьяўляецца [на] рынак ачысьціць каго небудзь.

Нарсуд другога вучастку прыга[ва]рыў Несьцяровіч да 1 году турэмн[ага] заняволеньня.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

— У чацьвер 3 лютага скліка[ец]ца нарада піонэраў комсамольцаў в[а]ворчых атрадаў Гарраёну, у пам[яш]каньні райкому.

Згублены.

— Часовае пасьведчаньне № 8[...] на імя Кандыбовіча Алеся, выдадз[е]нае Слуцкім акругкомам ЛКСМБ.

— Часовае пасьведчаньне № 7[...] на імя Казлова, выдадзенае Азярн[іц]кім райкомам ЛКСМБ.

Знойдзен

— Комсамольскі білет № 368[...] на імя Баўрыка Ўладзімера, выдад[зен]ы Слуцкім акругкомам. Знаходзі[цца] ў Грэскім райкоме ЛКСМБ.

„Круці, Гаўрыла!“

З далёку відаць яскравыя вагні кіно. Крычаць намалёваныя афішы. Сёньня дэмонструецца цікавая прыгодная кіно-стужка.

Вы парашылі ісьці ў кіно.

Натоўп людзей. Каса. Нейкія абарваныя хлапцы прапануюць вам купіць білет „бяз касы і без чаргі“.

Вы адмаўляецеся, бярэце білет у касе, купляеце програму—і вось вы ўжо ў «храме мастацтва». Вялічэзны гадзіньнік з рукой пасярэдзіне паказвае якая ідзе частка. Вы сядаеце і спакойна чакаеце. Зусім „па эўропейскі“.

Але вось распахваюцца парцьеры і публіка запаўняе зрыцельную залю. 2—3 хвілінкі ажыўленага гоману, пакуль публіка ўсядзецца, і становіцца цёмна. Застракатаў апарат. На белым палатне герой шукае сваю каханую, якая паміж тым папала ў бяду.. Страшэнны цігр кідаецца на гэроіню. Яшчэ адна хвілінка—і ён меў бы добрае сьнеданьне. Але... але кіно-стужка рвецца. Цігр застывае... Гэроіня стаіць падняўшы да неба рукі, з шырока расчыненым ротам...

Публіка, не шкадуючы ботаў, стучыць аб падлогу і як мага крычыць:

— Круці Гаўрыла, шавец барахольшчык, круці!“.

Усе нездаволены. Нейкі хлапец, узяўшы ў зубы „чорціка“, сьвішча на ўвесь тэатр.

А за сьпінамі ўсіх, у маленькай, вузкай каморцы, сярод розных машын і прыладаў, заліты асьляпляючым электрычным сьветам, сядзіць гэты «Гаўрыла» і нэрвова спраўляе недахоп. Праз маленькае ваконца будкі да яго даносіцца шум, гам і сьвіст публікі. Як-бы гэтага кіно-мэханіка ня клікалі, але калі крычаць «Гаўрыла»—ён добра ведае, што гэта пра яго.

„Гаўрыла“ за працай.

Ён сьпяшае. А праца нялёгкая. Тут трэба мець і добрыя вушы, і добрыя вочы, і спрытныя рукі. Бо ня ўгледзіш—і 10 пудоў (160 кілёграмаў) кіно стужкі успыхнуць чырвоным полымем... Ня ўгледзеш — і непакорны „Эрнэман“ (кіно-апарат)—пойдзе шалёным ходам і паламаецца. Уся будка кіно-мэханіка як быццам бы напоўнена электрычным токам. Дакраніся ня так, як належыць, да якой небудзь часткі—і ток заб'е на месцы.

— Хутчэй, хутчэй...

600 чалавек узбураны супроць аднаго. Крыкі не спыняюцца.

— Ну, вось... спраўлена.

Зноў застракатаў апарат.

Усё ажывае.

У самы апошні момант адважны гэрой ратуе гэроіню. Крыважаднага цігра застрэльваюць.

Скончан сэанс. Позна.

З будкі выходзіць змучаны кіномэханік.

...Паволі тухнуць яскравыя агні...

ЭД. ГАЛУБОК.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

КОМСАМОЛЬЦУ (Рудзенск)—«Працы напаказ»—друкавацца ня будзе. Няма цікавага. Рэдакцыя табе выслала ліст, [дзе] ты знойдзеш практычныя парады аб [тым як] пісаць.

КУЛІКОВУ М. (Талочына)—Допіс [аб] «агітпроза» вашай ячэйкі—ня пойдзе. У [ім] ня відаць таго, што ты хацеў сказаць.

ШАБАНУ (Ганцавіцкая яч. ЛКСМБ)—Дасягненьняў працы вашай ячэйкі у до[пісе] ня відно. Ня пойдзе. Табе рэдакцыя выс[лала] спэцыяльны ліст, дзе ты навучышся, аб [чым] трэба пісаць.

НЭЙЧУ (Вульчынская ПСМ)—Ма[тэрыя]лак «З цемры у сьвет»—змешчан ня б[удзе]. Ты Кастуся Ялавіча зрабіў бышцым добр[ым] чалавекам, у той час, калі ён гэтага [не] варт. Другі матэрыял будзе зьмешчан.

Адказныя рэдактары: А. БАРАНЬНІК[ОЎ], В. КУРЦІК

Галоўлітбел № 23985 2-ая Дзярждрукарня БДВ.